А. Бацюня, У. Камера, Ф. Кузняцоў, А. Пянькоўскі і інш. У складзе толькі ваенна-паветраных сіл, бранятанкавых і механізіраваных злучэнняў ваявала амаль 8 тыс. афіцэраў – выхадцаў з Беларусі .

За гераізм і мужнасць, праяўленыя ў баях Вялікай Айчыннай вайны, звыш 300 тыс. беларусаў і ўраджэнцаў рэспублікі ўзнагароджаны ардэнамі і медалямі, 444 сталі Героямі Савецкага Саюза, 67 чалавек – поўнымі кавалерамі ордэна Славы; 4 беларусы – званне Героя Савецкага Саюза атрымалі двойчы: І. Якубоўскі, І. Гусакоўскі, С. Шутаў, П. Галавачоў .

Беларускі народ з вялікай павагай адносіцца да сваіх землякоў – ветэранаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, свята шануе памяць тых, хто не вярнуўся з паля бітвы. Аб гэтым сведчаць тысячы брацкіх магіл, помнікаў, мемарыяльных дошак і комплексаў. Імёны героеў увасоблены ў назвах вуліц, школ, мемарыяльных музеяў.

**С. Я. Новікаў**

## ВЫЗВАЛЕННЕ БЕЛАРУСІ ЛЕТАМ 1944 г. У СВЯТЛЕ НОВЫХ ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫХ ФАКТАЎ

У аснову нашага гістарыяграфічнага аналізу пакладзены найноўшыя айчынныя (беларускія і расійскія) і замежныя (нямецкія) навуковыя працы, выхад якіх сведчыць не толькі аб пачатку фарміравання новых гістарычных ведаў, але і адпаведных даследчыцкіх наратываў аб баявых дзеяннях Чырвонай арміі і германскага вермахта ў Беларусі летам 1944 года. Адразу ж заўважым, што гісторыкі гэтых дзвюх груп не толькі выкарыстоўваюць розную дакументальную базу, але і кіруюцца процілеглымі метадалагічнымі падыходамі, якія прыводзяць да непараўнальных ацэнак адных і тых жа падзей гісторыі вызвалення Беларусі летам 1944 года.

Б е л а р у с ь. Зыходным момантам для разгляду баявых дзеянняў Чырвонай арміі па вызваленні тэрыторыі Беларусі ў 1944 г. з'яўляецца навуковы наратыў, закладзены яшчэ ў энцыклапедыі савецкага часу «Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны, 1941–1945». З яго вынікае, што беларускі чытач там не знойдзе вычарпальную інфармацыю пра няўдалыя спробы Заходняга фронту вызваліць паўночна-ўсходнія раёны Беларусі ўжо восенню 1943 – пачатку 1944 г., паколькі галоўны акцэнт быў зроблены толькі на Беларускай стратэгічнай наступальнай аперацыі «Баграціён». У дачыненні да гэтых падзей беларускія даследчыкі выкарыстоўваюць наступную тэрміналогію: Беларуская наступальная аперацыя 1944 г. «Баграціён»; Беларуская стратэгічная наступальная аперацыя; аперацыя «Баграціён».

Адзначым, да гэтага часу ў беларускай гістарыяграфіі пакуль не праведзена спецыяльнае даследаванне, у аснове якога ляжалі б новыя айчынныя і замежныя дакументы, вынікі найноўшай замежнай гістарыяграфіі ў дачыненні да адлюстравання гісторыі баявых дзеянняў як Чырвонай арміі, так і германскага вермахта ў Беларусі летам 1944 года. Фактам з'яўляецца і тое, што на цяперашні час назапашаны значны эмпірычны матэрыял, які пакуль застаецца без комплекснага аналізу беларускіх гісторыкаў.

Р а с і я. Кажучы пра расійскую гістарыяграфію, прысвечаную гісторыі вызвалення Беларусі ў 1944 г., спынімся на трох найноўшых фундаментальных выданнях. Першае – 4-томная праца «Великая Отечественная война. 1941–1945» (канец 1990-х гг.). Прадстаўляючы ў трэцім томе аперацыю «Баграціён», расійскія даследчыкі адзначаюць, што яна па праву можа лічыцца адной з самых бліскучых аперацый не толькі Вялікай Айчыннай, але і Другой сусветнай вайны. «Операция “Багратион” явилась первой стратегической наступательной операцией Красной Армии, проведенной в период, когда в Западной Европе начали военные действия вооруженные силы США и Англии».

Аналіз другога матэрыялу, які ўвайшоў у 4-ы том «Освобождение территории СССР. 1944 год» новага 12-томнага фундаментальнага выдання «Великая Отечественная война 1941–1945 годов» дае магчымасць убачыць асноўныя падыходы, ацэнкі і вынікі ў дачыненні да баявых дзеянняў ва Усходняй Беларусі і пры яе вызваленні ў ходзе «Беларускай наступальнай аперацыі» ці аперацыі «Баграціён». Аўтары канстатуюць ужо згаданую вышэй тэзу.

Адзначым, што агульнай прыкметай для згаданых як беларускіх, так і расійскіх выданняў з’яўляецца адсутнасць добра вядомых на цяперашні час дакументаў супрацьлеглага боку пры аналізе гісторыі баявых дзеянняў Чырвонай арміі і германскага вермахта на тэрыторыі Беларусі. У згаданых працах айчынныя даследчыкі практычна не выкарыстоўваюць спецыяльныя нямецкія даследаванні, абыходзяць маўчаннем найноўшыя замежныя распрацоўкі, прысвечаныя гэтай тэме. Да ўсяго, айчынныя гісторыкі не ўвялі ў навуковы зварот трафейныя нямецкія дакументы, якія захоўваюцца ў фондах РДзВА ў Маскве і ЦАМА РФ у Падольску. Не з’яўляецца выключэннем і 4-ы том найноўшага 12-томнага выдання, дзе пры разглядзе баявых дзеянняў ва Усходняй Беларусі аўтары прывялі 251 спасылку, але толькі ў 12 з іх прыведзена згадка на 8-ы том («Германскі рэйх і Другая сусветная вайна»), які носіць назву «Усходні фронт 1943/44». Ці можа такое кропкавае выкарыстанне спрыяць усебаковаму даследаванню двухбаковых баявых дзеянняў, асабліва высвятленню дакладных прычын няўдач Чырвонай арміі на тэрыторыі Беларусі ў 1943–1944 гг.?

Як вынік, у выдадзеных у Беларусі і Расіі фундаментальных працах у тэкстах нагрувашчаны вялікі масіў эмпірычных матэрыялаў, датычнага паказу тых гістарычных падзей, але не з двух, а толькі з аднаго – савецкага боку. Пры гэтым часта атрымліваецца, што Чырвонай армія вяла наступленне на невядомага ці «безыменнага праціўніка»: без прывядзення канкрэтных звестак пра агульны колькасны і штатны склад германскіх палявых і паветраных часцей вермахта, без вызначэння дакладнай лакалізацыі войск праціўніка на мясцовасці, не раскрываючы структуры яго баявых падраздзяленняў, маштабаў выкарыстання тэхнікі і ўзбраенняў, і ў выніку не параўноўваючы панесеныя з абодвух бакоў страты, агульную колькасць зніклых без вестак, патрапіўшых у палон і г.д. Гэта значыць, без фактычнай ацэнкі сіл праціўніка аддаваліся загады аб правядзенні наступальных аперацый па вызваленні Беларусі ў 1944 г.

Г е р м а н і я. У адрозненне ад беларускіх і расійскіх фундаментальных работ у Германіі яшчэ ў другой палове нулявых гадоў была падрыхтавана больш чым 1000-старонкавая праца аб гістарычных падзеях на Усходнім фронце ў 1943–1944 г., у тым ліку аб баявых дзеяннях германскага вермахта на тэрыторыі Беларусі. Заўважым пры гэтым, што праца з таго часу шырока даступна беларускаму чытачу. Нямецкі даследчык доктар Фрызер К.-Г., які працаваў з масівам самых розных дакументаў, у тым ліку з РГВА і ЦАМО, даволі падрабязна раскрывае характар гістарычных падзей на "Усходнім фронце 1943/44", асабліва на момант разгрому групы армій «Цэнтр».

Кажучы пра крах групы армій «Цэнтр» летам 1944 г., Фрызер аналізуе вынікі баявых падзей ў ходзе паспяхова праведзенай наступальнай аперацыі «Баграціён». Паводле дакументальных крыніц наступаючым савецкім войскам супрацьстаялі сілы 2-й, 4-й і 9-й палявых і 3-й танкавай армій агульнай колькасцю 486 493 салдаты, а таксама 3 236 гармат, 118 танкаў і 452 САУ, 602 самалёты. Нямецкі гісторык адзначае, што з пачаткам першай фазы аперацыі «Баграціён» савецкі бок пераўзыходзіў у жывой сіле ў 3,7 раза, артылерыі – у 9,4, танках – у 23 разы, самаходных установках – у 3,6 і самалётах – у 10,5 раза. Да таго ж групе армій «Цэнтр» давялося весці вайну фактычна на два франты: у якасці «другога фронту» выступалі амаль 150 тысяч партызан, якія дзейнічалі ў тыле нямецкіх армій.

Заўважым, што нямецкія сілы супрацьстаялі савецкім войскам агульнай колькасцю ў 1,2 млн чалавек, то бок: «В общей сложности на белорусском направлении действовали 63 дивизии. В них насчитывалось 1,2 млн человек, 900 танков и штурмовых орудий, 9 500 полевых орудий и минометов. С воздуха германские войска поддерживала авиация 6-го и частично 1-го и 4-го воздушных флотов в количестве 1 350 боевых самолетов». У дачыненні да канчатковых страт, панесеных з савецкага боку ў ходзе аперацыі «Баграціён», нямецкі ваенны гісторык прыводзіць наступныя даныя: былі панесены страты, якія складалі 770 888 чалавек (з якіх 180 040 – забітыя і прапаўшыя без вестак, 590 848 – параненыя). Апрача таго, савецкі бок страціў 2 957 танкаў і САУ, 2 447 адзінак артылерыі і 822 самалёты.

Катастрофу групы армій «Цэнтр» наглядна характарызуюць статыстычныя даныя аб стратах, панесеных з абодвух бакоў падчас правядзення летняй аперацыі ў Беларусі. Паводле нямецкіх звестак агульныя страты з нямецкага боку склалі 399 102 чалавекі, у тым ліку: 26 397 – забітыя, 262 929 – прапаўшыя без вестак і 109 776 – параненыя. Гэта пераўзыходзіць маштабы нямецкай катастрофы ў бітве пад Вердэнам у 1916 г., калі германскі рэйхсвер страціў 330 тыс. чалавек (разам з параненымі), і значна пераўзыходзіць страты 6-й германскай арміі пад Сталінградам (60 тыс. забітымі і 110 тыс. палоннымі). Такім чынам, Фрызер заключае, што аперацыя «Баграціён» застаецца самай бліскучай аперацыяй, праведзенай Чырвонай арміяй на працягу ўсёй Вялікай Айчыннай вайны.

Падсумоўваючы вышэй сказанае адзначым: па-першае, аналіз найноўшых фундаментальных прац, праведзеных у апошнія гады вядучымі беларускімі, расійскімі і нямецкімі даследчыкамі, пераканаўча сведчыць аб фарміраванні розных наратываў у нацыянальных гістарыяграфіях Беларусі і Расіі,

Германіі. Па-другое, расійскім і нямецкім гісторыкам удалося запоўніць навуковы прабел у даследаванні згаданай праблематыкі і падрыхтаваць спецыяльныя працы ў рамках згаданай праблематыкі, тады як у беларускай гістарычнай навуцы па цяперашні час адсутнічае спецыяльная навуковая работа, якая б закрывала гэту важную тэму. Па-трэцяе, важнейшым вынікам разгляду можна лічыць не толькі ўзбагачэнне замежных гістарыяграфій адным з актуальных кірункаў даследавання, але і яго практычную распрацоўку з мэтай вывучэння заключнага перыяду гісторыі Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў у Беларусі.

**А. Г. Цымбал**

## БЕЛАРУСКІ КІРУНАК ПОЛЬСКАЙ ПАЛІТЫКІ ПАМЯЦІ

Сучасныя сацыяльныя навукі для апісання феномена функцыянавання гісторыі ў грамадстве выкарыстоўваюць шэраг паняццяў: *гістарычная палітыка*, палітыка памяці і інш. Усе яны ў першую чаргу датычацца мэтанакіраванага канструявання грамадскіх уяўленняў аб сваім мінулым і сучасным, пабудове пэўнага варыянту ідэнтычнасці сацыяльных груп, сацыяльнай, культурнай і палітычнай інжынерыі. Праблемы суадносін гісторыі і памяці, гістарычнай палітыкі, палітыкі памяці даследаваліся шматлікімі навукоўцамі: П. Нара, А. Міллерам, Г. Касьянавым, Р. Трабай і інш.

Узаемадзеянне гісторыі і памяці зводзіцца да некалькіх пазіцый: 1) гісторыя супрацьпастаўляецца памяці; 2) гісторыя і памяць разглядаюцца як формы разумення, інтэрпрэтацыі і рэпрэзентацыі мінулага, якія дапаўняюць адна адну; 3) гісторыя і памяць атаясамліваюцца. Для гістарычнай палітыкі, а дакладней, аднаго з яе элементаў – палітыкі памяці, характэрны менавіта апошні падыход. Атаясамленне гісторыі і памяці ўласціва для палітычных і ідэалагічных дыскурсаў. Менавіта выкарыстанне азначэння *палітыка памяці* больш адпавядае сутнасці спроб дзяржавы і ўлад інструменталізаваць гісторыю для дасягнення актуальных палітычных мэт. Яна накіравана на фарміраванне пэўнага вобразу памяці аб мінулым у сацыяльнай групы. Такая памяць заўсёды актуальна, звязана з сучасным жыццём, легітымізуе існуючы стан рэчаў. Памяць эмацыйна, міфалагічна. У адрозненне ад памяці гісторыя крытычна і аналітычна і імкнецца да дэканструкцыі наратываў памяці. Такім чынам, пад палітыкай памяці разумеецца фарміраванне пэўнай калектыўнай ці гістарычнай памяці на ўзроўні масавай палітыкі.

З 2005 г. у Польшчы з прыходам да ўлады праваkансерватыўнай партыі «Права і справядлівасць» было заяўлена аб неабходнасці рэалізацыі новай гістарычнай палітыкі з мэтай узмацнення польскай нацыянальнай ідэнтычнасці і адзінства. Размова ішла пра поўны перагляд польскай гісторыі, зварот да вопыту, асаблівай гістарычнай ролі і місіі Польшчы. Галоўным рэалізатарам палітыкі стаў Інстытут нацыянальнай памяці (ІПН) – установа, якая сумяшчае навукова-даследніцкія і следчыя функцыі. Фактычна пачалася рэвізія мінулага з мэтай "нармалізацыі" гісторыі дзеля ідэі кансалідацыі нацыі, праз сцвярджэнне ў калектыўнай памяці пазітыўных фрагментаў і сюжэтаў гісторыі.